Таким образом, можно предположить, что исконность аффикса в большей степени, нежели исконность деривационной базы, влияет на продуктивность словообразовательного процесса и образование гибридов в английском языке.

На базе онлайн-сервиса GoogleNgramViewer нами также был проведен сопоставительный анализ частотности производящего прилагательного и производного гибридного существительного с суффиксом *-ness*, а также производящего глагола и производного гибридного существительного с суффиксом *-ment*. Было установлено, что частотность гибридных дериватов примерна такая же, как частотность их производящих единиц, т.е. субстантивные суффиксы разного происхождения не оказывают существенного влияния на коммуникативную значимость производного гибрида.

**К. Масэ**

## КРЫНІЦЫ ПРЭЦЭДЭНТНАГА ВОБРАЗА РАЮ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Прэцэдэнтны змест паэтычнага твора ўяўляе сабой адзін з найважнейшых складнікаў, што ўтвараюць яго вобразны падмурак. На матэрыяле сучаснай беларускай паэзіі мы прааналізавалі крыніцы аднаго з прэцэдэнтных вобразаў – вобраз пэўнага казачнага свету/краіны/горада.

У сучаснай беларускай паэзіі гэты вобраз распрацоўваецца ў рамках некалькіх тыпаў дыскурсу, якія служаць крыніцамі адпаведных прэцэдэнтаў. Часцей за ўсё гэта:

1) біблейскі (старазапаветны), які рэалізуецца ў звароце да архетыпічных элементаў Эдэмскага саду і суправаджаецца ідэяй выгнання;

2) арыентальны, да якога мы адносім алюзіі да міфалагічнай і рэлігійнай канцэптасфер азіяцкіх культур;

3) антычна-еўрапейскі, які ўключае ў сябе канцэпты «залатога веку», страчанай Атлантыды, космасу як дасканалага парадку ўсіх рэчаў, ідэі меры, гармоніі, месца чалавека ў сістэме светабудовы і т.п.;

4) скандынаўскі, у свядомасці беларускага паэта звязаны з сакралізацыяй вобразаў зімы, поўначы, а таксама суровых умоваў жыцця і г.д.

5) славянска-язычніцкі, увасабленнем характва, моцы і шчасця ў якім з’яўляецца вобраз выспы Буяна, а таксама адушаўлёная і абагаўлёная прырода;

6) сацыяльна-ўтапічны, які пазбаўлены міфічнай канатацыі і апелюе да канцэпцый ідэальнага грамадскага жыцця. У выпадку беларускай паэзіі міф увасоблены ў ідэі сумавання па «вечна недасяжнай» Радзіме;

7) персаналізаваны, у рамках якога аўтарам ствараецца індывідуальны комплекс паняццяў для выражэння асабістай міфалагічнай рэчаіснасці.

Агульнымі для пералічаных форм рэпрэзентацыі вобраза раю ёсць ідэі цыклічнасці часу і «лакалізацыі» міфічнага краю на метафізічным усходзе або поўначы. Для беларускай ментальнасці культываванне ўтапічных вобразаў уяўляецца вельмі рэсурсным у плане рэканструкцыі дрэва народнай міфалогіі з усім тым станоўчым дыдактычным, пазнавальным і матывавальным досведам, што нясуць у сабе ўсе светлыя міфічныя вобразы, цэнтральным з якіх, верагодна, з’яўляецца вобраз раю.